Абласная, 20/12. I вар.

Шыфр: 1 варыянт

Колькасць балаў:________________

Месца:___________________

**Зацвярджаю**

**Намеснік старшыні**
**арганізацыйнага камітэта**
**намеснік Міністра адукацыі**
________________ **К.С. Фарыно**
«20» 12 2011 года

# III ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

**10 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

## Варыянт 1

**Заданне 1.** Вызначце і запішыце па-беларуску лексічнае значэнне рускага і беларускага слова ў пары.

*Узор: краска – краска: палявая кветка – рэчыва, якое надае пэўны колер прадметам.*

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

| | |
|---|---|
| 1) кожны – кожный: | |
| 2) па́ра – па́ра: | |
| 3) зычны – зычный: | |

**Заданне 2.** Аб'яднайце пары слоў у групы паводле сэнсавых адносін слоў у парах. Назавіце гэтыя групы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Закахацца – утрэскацца, магістрат – магістрант, родны – чужы, смяяцца – плакаць, таварыства – суполка.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 3.** Упішыце словазлучэнні ў патрэбныя слупкі табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

(Б, б)ог яго ведае, (Дз, дз)ень (М, м)оладзі, (Д, д)ынастыя (Р, р)аманавых, (К, к)аралеўства (Б, б)ельгія, (М, м)езазойская (Э, э)ра, (П, п)аўночны (П, п)олюс, (П, п)расвятая (Т, т)ройца, (С, с)іямскі (К, к)от, (Т, т)аніны (С, с)шыткі, (У, у)ральскія (Г, г)оры.

| Усе словы з малой літары | 1-е слова з вялікай літары | 2-е слова з вялікай літары | Усе словы з вялікай літары |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 4.** Патлумачце значэнне фразеалагізма (*1*). Запішыце фразы, у якіх названы фразеалагізм выконвае ролю розных членаў сказа (*2*).

*Максімальная колькасць балаў – 6 (1 + 5).*

*альма матар*____________________________________________________________

| Член сказа | Ілюстрацыя |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 5.** Дакажыце пры дапамозе марфемнага аналізу, што прыведзеныя пары слоў з'яўляюцца амонімамі: *адбівацца – адбівацца, выпадаць – выпадаць, гаркавы – гаркавы, далажыць – далажыць*.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

| Марфемная структура | Значэнне | Марфемная структура | Значэнне |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 6.** «Напішыце» беларускую частку артыкула ў паралексічным слоўніку да дзеяслова ***ткаць***. У двухскладовых формах укажыце націск. Якія слоўнікі называюцца паралексічнымі?

*Максімальная колькасць балаў – 7 (6 + 1).*

| Ткаць | Ткать |
|---|---|
| | тку |
| | ткёшь |
| | ткёт |
| | ткём |
| | ткёте |
| | ткут |
| | ткал (прош.) |
| | ткалá |
| | ткáло |
| | ткáли |
| | тки (пов.) |
| | тките |

Паралексічны слоўнік – гэта…

**Заданне 7.** Прыведзенае выказванне характарызуецца сэнсавай неадназначнасцю. Запішыце магчымыя варыянты яго значэнняў, паставіўшы патрэбныя знакі прыпынку.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

*Ён выкрыў што ў тых мільёнах гукаў якія чуе на кожным кроку усюды і ў любы час няма сходных між сабою.*

**Заданне 8.** Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 9 (1 бал за правільны адказ).*

| **Род літаратуры** | **Аўтар** | **Сапраўднае імя** | **Твор** | **Жанр** | **Ідэя і яе ўвасабленне** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | "Слуцкія ткачыхі" | Грамадзянская лірыка | Любоў да Радзімы і волі праз вобраз васілька |
| Эпас | | | "Губаты" | | Дабрыня і міласэрнасць да прыроды, шматфарбнасць навакольнага свету, лірычнасць аповеду |
| | Янка Купала | | | Камедыя з элементамі драмы | Канфлікт пакаленняў, высмейванне пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці, індывідуалізацыя мовы персанажаў, элементы вадэвілю |

**Заданне 9.** Знайдзіце два адасобленыя элементы ў пераліку, якія не суадносяцца з іншымі тэрмінамі. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 4 (2 балы за правільнае вызначэнне, 2 балы за тлумачэнне).*

Раман, экспазіцыя, развязка, лірызм, энцыклапедыя, завязка, апавяданне, паэма, эпізод, кульмінацыя, камедыя, байка, верш.

АБГРУНТАВАННЕ:

**Заданне 10.** Устаўце прапушчаныя словы, запішыце назву твора і яго аўтара.

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ______________–,
Каб не страціць святое штосьці.
Не забыць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню ___________________ асвер
___________________________ руку да пахі.

Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што у хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.

Не забыць, як марозам злым
_____________________ пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.

Помніць свой на _____________________ цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом бяседа.

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою ты стаў чысцей
І не страціў святое штосьці.

НАЗВА ТВОРА:_____________________________________________.

АЎТАР ТВОРА:_____________________________________________.